ШТО, ДЗЕ, КАЛІ...

# ПАМЯЦІ П. М. МАШЭРАВА

Далёка за межамі рэспублікі ведаюць імя савецкага і партыйнага дзеяча, Героя Савецкага Саюза і Героя Сацыялістычнай Працы Пятра Міронавіча Машэрава.

23-гадовы настаўнік фізікі і матэматыкі Расонскай сярэдняй школы на Віцебшчыне П. М. Машэраў з самага пачатку Вялікай Айчыннай вайны ўзначаліў падпольную камсамольскую арганізацыю і быў адным з кіраўнікоў партызанскага руху ў Расонскім раёне. Добра памятаюць яго былыя партызаны і падпольшчыкі як камандзіра партызанскага атрада імя Шчорса, камісара партызанскай брыгады імя Ракасоўскага, першага сакратара Вілейскага падпольнага абкома ЛКСМБ.

Пасля вызвалення Беларусі Пётр Міронавіч працаваў на адказнай партыйнай рабоце ў розных мясцінах рэспублікі, а з 1959 г.— у апараце ЦК КПБ: спачатку сакратаром, пасля другім сакратаром, а з 1965 г.— першым сакратаром ЦК КП Беларусі. Быў кандыдатам у члены Палітбюро ЦК КПСС, дэпутатам Вярхоўных Саветаў СССР



Гіпсавы бюст Пятра Міронавіча Машэрава, бронзавая адліўка з якога ўстаноўлена ў каюце-музеі на акіянскім лайнеры «Пётр Машэраў».

і БССР некалькіх скліканняў, членам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. Узнагароджаны пяццю ордэнамі Леніна і шматлікімі медалямі.

Памяць аб П. М. Машэраве не толькі як аб дзяржаўным і партыйным дзеячы, але і як аб чалавеку незвычайнай абаяльнасці, сціпласці, душэўнай шчодрасці навекі захавалася ў сэрцы беларускага народа.

У студзені 1981 г. была прынята пастанова ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР аб увекавечанні памяці П. М. Машэрава. Згодна з ёю Паркавая магістраль у Мінску перайменавана ў праспект імя П. М. Машэрава, яго імя прысвоена Расонскай сярэдняй школе і саўгасу «Машкань» на Віцебшчыне, Мінскаму заводу аўтаматычных ліній, Віцебскаму заводу металаканструкцый. На доме па Чырвонаармейскай вуліцы, дзе ён жыў, і на доме № 1 па праспекце імя Машэрава ўстаноўлены мемарыяльныя дошкі. Інстытуту гісторыі партыі пры ЦК КПБ і Дзяржкамвыду БССР даручана выпусціць зборнік яго артыкулаў і выступленняў.

У канцы 1981 г. са стапеляў Гданьскай суднаверфі сышоў цеплаход «Пётр Машэраў», прапісаны ў Ленінградскім порце. Не першы год бараздзіць ён моры і акіяны свету. У спе-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы